**І.М. Грамовіч**, *дацэнт*

# АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ

(факультэт музычнага мастацтва)

Значнасць ролі і месца самастойнай работы ў навучальным працэсе вызначаецца сучаснымі патрабаваннямі грамадства да сістэмы адукацыі. Самаадукацыя з'яўляецца адной з важнейшых частак прафесійнай культуры студэнтаў музычных спецыяльнасцей, у яе працэсе замацоўваюцца веды, уменні і навыкі, развіваюцца творчыя здольнасці, выяўляецца схільнасць да навуковай дзейнасці.

Увогуле спецыфіку арганізацыі вучэбнага працэсу на музычным факультэце немагчыма ўявіць без самастойнай работы студэнтаў. На самой справе, не можа быць абмежавана пэўнай колькасцю вучэбных гадзін падрыхтоўка музыканта, таму што чым больш ён працуе самастойна, тым больш узрастае яго прафесійнае майстэрства. Менавіта ў такой падрыхтоўцы будучых спецыялістаў музычнага мастацтва зацікаўлены кожны выкладчык.

Суадносіны самастойнай аўдыторнай і пазааўдыторнай работы студэнтаў павінны вызначацца з улікам наяўнасці, даступнасці і якасці вучэбна-метадычнага, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння вучэбнага працэсу і аб'ёму вывучаемага вучэбнага матэрыялу. Арганізацыя кіруемай самастойнай работы на факультэце і кафедрах прадугледжвае распрацоўку неабходных дакументаў. Па-першае, гэта палажэнне аб самастойнай рабоце на факультэце, па-другое, планаванне, графікі, тэхналагічныя карты навучальнага працэсу, формы кантролю, змест і ўлік заданняў па самастойнай рабоце, а таксама забеспячэнне студэнтаў спецыяльнай вучэбна-метадычнай літаратурай з рэкамендацыямі па самастойнай падрыхтоўцы да заняткаў па спецыяльнай дысцыпліне. Гэтыя меры павінны адпавядаць наступным патрабаванням:

– асэнсаванне студэнтамі сутнасці і значнасці самастойнай работы;

– упэўненасць студэнтаў у тым, што яны могуць выканаць заданні, прапанаваныя для самастойнай падрыхтоўкі;

– суаднесенасць аб'ёму і ўзроўню складанасці заданняў, паслядоўнасці іх выканання, адпаведнасць індывідуальным здольнасцям навучэнцаў;

– асэнсаванне мэт і задач, зместу і спецыфікі вывучаемага прадмета, метадычнай сутнасці самастойнага выканання заданняў.

Уменне працаваць самастойна не можа быць аднолькавым на розных ступенях навучання. Неабходна па меры авалодання навыкамі і ўменнямі самападрыхтоўкі павялічваць аб'ём самастойнай работы, пашыраць яе формы, паслядоўна пераходзячы ад простых да больш складаных, на кожным этапе ўскладняць патрабаванні да самастойнай работы, змяняць мэты і задачы, захоўваючы яе творчы характар. І, нарэшце, выкладчык павінен пастаянна і ўмела кантраляваць самастойную работу.

На першым, падрыхтоўчым, этапе ажыццяўляецца планаванне самастойнай работы. Яно ўключае канкрэтныя мэты індывідуальнай і групавой работы студэнтаў, дакладнае размеркаванне гадзін, якія адводзіць выкладчык на самастойную работу студэнтаў, распрацоўку рабочай праграмы з вызначэннем тэм і заданняў. Зацвярджаецца план на пасяджэннях кафедры і вучэбна-метадычнай камісіі факультэта.

Звернем увагу на месца самастойнай работы ў структуры вучэбнага плана. На сучасным этапе выкладчыкі ў сваіх індывідуальных планах не плануюць пэўную колькасць гадзін на самастойную работу. Кантроль адбываецца на індывідуальных і групавых занятках. Працуючы ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па спецыяльнай дысцыпліне, выкладчык фактычна выкарыстоўвае ўсе гадзіны, што складаюць яго выкладчыцкую нагрузку. На кантроль за самастойнай работай (напрыклад, харавых і аркестравых партытур) выкладчык траціць свой уласны час.

На другім этапе, арганізацыйным, вядзецца праца па стварэнні рабочых праграм па вучэбных дысцыплінах, рыхтуюцца вучэбна-метадычныя дапаможнікі і комплексы, метадычныя ўказанні для самастойнай работы. На дадзеным этапе студэнт павінен атрымаць дакладную інфармацыю аб усіх формах самастойнай работы па той ці іншай вучэбнай дысцыпліне з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначэннем абавязковых заданняў. На гэтым этапе стаіць праблема забеспячэння вучэбна-метадычным матэрыялам, і асабліва наяўнасці вучэбна-метадычных комплексаў па кожным спецыяльным прадмеце. Вучэбна-метадычны комплекс распрацоўваецца па кожнай дысцыпліне. У яго ўваходзяць практыкумы, метадычныя матэрыялы, рэпертуарныя зборнікі, хрэстаматыі па дырыжыраванні, даведнікі, метадычныя ўказанні, праграмы. Мы не можам не пагадзіцца з меркаваннямі аб тым, што распрацоўка і ўжыванне вучэбна-метадычных комплексаў спрыяе пераносу цэнтра цяжару на дзейнасць студэнта, на самакантроль і самаацэнку студэнтам працэсу навучання і яго вынікаў. Блочна-модульная тэхналогія вучэбна-метадычных комплексаў дапамагае:

– больш эфектыўна арганізаваць самастойную работу студэнтаў (саманавучанне);

– рэгуляваць тэмпы работы і змест вучэбнага матэрыялу;

– наладзіць самакантроль і самаацэнку студэнтамі вынікаў навучання.

На кафедры беларускай народна-песеннай творчасці распрацавана сістэма модульнага навучання па дырыжыраванні. Яна ўключае дакладна сфармуляваныя вучэбныя мэты, змест вучэбнага матэрыялу, метадычнае і тэхналагічнае забеспячэнне дыдактычнага матэрыялу (сістэму заданняў, метадычнае кіраўніцтва па іх самастойным выкананні з мэтай набыцця пэўных навыкаў і уменняў, формы кантролю). На кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі створаны вучэбныя комплексы, якія поўнасцю адпавядаюць патрабаванням вышэйшай школы.

У сучаснай музычнай педагогіцы ёсць меркаванні, што ў навучанні музыканта пераважае аднабаковы трэнаж харавых і інструментальных партый. Студэнт не праяўляе творчай актыўнасці пры выкананні таго ці іншага твора, яго веды не выходзяць за межы вузкай спецыялізацыі. Устараненне гэтага недахопу бачыцца ў фарміраванні ў студэнтаў агульнай музычнай культуры, прафесійнага мыслення, творчага падыходу да выканання заданняў па самастойнай рабоце, універсальных уменняў, а таксама набыцці разнастайных ведаў. Важная роля ў падобным рэфармаванні вучэбнага працэсу адводзіцца распрацоўцы міжпрадметных модуляў адпаведна ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Умовай эфектыўнасці кантрольна-ацэначнага этапа кіруемай самастойнай работы з'яўляецца кантроль, які можа ажыццяўляцца пры дапамозе кантрольнага ўрока, тэхнічнага заліку, акадэмічнага канцэрта, вынікаў модульна-рэйтынгавай сістэмы, кантрольнай работы, анатацыі, справаздачы аб праходжанні практыкі, выступлення на студэнцкіх канферэнцыях, публікацый, удзелу ў навукова-даследчай рабоце.

На жаль, самастойная работа на факультэце знаходзіцца на стадыі станаўлення, яшчэ не пазбавілася яна рыс стыхійнасці і не з'яўляецца дастаткова "кіруемай". Сёння перад факультэтам ставіцца задача аптымізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і памяншэння аўдыторнай нагрузкі як выкладчыка, так і студэнта. Неабходна актывізаваць падрыхтоўку метадычных матэрыялаў па пастаноўцы голасу, спецінструменту, харавому і эстраднаму класах, інструментоўцы, аранжыроўцы, сцэнічным руху, акцёрскім майстэрстве і інш.

Існуе яшчэ праблема, ад якой залежыць эфектыўнасць самастойнай работы студэнтаў. Гэта праблема аўдыторнага фонду. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў не хапае аўдыторый для самападрыхтоўкі па музычных дысцыплінах, аркестравыя і харавыя класы не прыстасаваны для рэпетыцый, у інтэрнацкіх пакоях адсутнічае фартэпіяна. На музычных інструментах факультэта ўвогуле немагчыма іграць. Акрамя таго, вялікая вучэбная нагрузка выкладчыкаў не дазваляе ім на якасным узроўні кантраляваць самастойную работу студэнтаў і выкарыстоўваць новыя формы кантролю. У індывідуальных планах выкладчыкаў адсутнічае графа кантролю і кіраўніцтва самастойнай работай.

У Адукацыйным стандарце вялікая ўвага звяртаецца на вывучэнне агульнагуманітарных дысцыплін, але недастаткова выяўлена спецыфіка музычнай падрыхтоўкі студэнтаў музычных спецыяльнасцей. Эфектыўнасць падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў фальклорных і харавых калектываў, інструментальных ансамбляў і аркестраў, выканаўцаў народнай, класічнай і эстраднай музыкі немагчыма без павелічэння гадзін на спецыяльныя прадметы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць, на самастойную работу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Жук, О.Л.* Педагогические основы самостоятельной работы студентов: пособие для преп. и студ./ О. Л. Жук [и др.]; под общ. ред. О.Л. Жук. – Мн.: РИВШ, 2005. – 112 с.

2. *Псіхалага-педагагічныя* і метадычныя праблемы актывізацыі самастойнай пазнавальнай работы студэнтаў: матэрыялы навук.-метад. канф. (1–2 лютага 2001 г.) / рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2001. – 181с.

3. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В. Сергеенкова. – Мн.: РИВШ, 2004. – 132 с.

**Н.И. Гуд,** *старший преподаватель*

## АНАЛИЗ СПЕЦИАЛЬНЫХ И ТРАДИЦИОННЫХ ФОРМ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ И ВИДОВ ЕЕ КОНТРОЛЯ

(факультет культурологии и социокультурной деятельности)

Последовательная выработка навыков самостоятельной работы в различных сферах деятельности, развитие у обучающихся познавательных мотивов, готовности к самообразованию, рефлексивных умений и критического мышления – одна из основных целей учебного процесса в соответствии с требованиями реформирования высшего образования. В ее достижении главную роль выполняет самостоятельная работа студентов, которая осуществляется в двух уровнях:

1) собственно самостоятельная работа, организуемая самим студентом в рациональное с его точки зрения время, как правило внеаудиторная, мотивируемая собственными познавательными потребностями и контролируемая им самим;

2) управляемая самостоятельная работа студентов как опосредованное управление со стороны преподавателя деятельностью студента по самостоятельному выполнению поставленного преподавателем учебного (исследовательского) задания.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ